сеткі Internet, методыцы навучання камп'ютэрным гульням і знаёмству з канкрэтнымі ўзорамі камп'ютэрных гульняў асноўных кірункаў.

Дадзены курс выклікае вялікую цікавасць і хутка і лёгка засвойваецца студэнтамі. Мэта вучэбнай дысцыпліны "Камп'ютэрныя гульні" – фарміраванне ў будучых сацыяльных педагогаў тэарэтычных ведаў і практычных уменняў па выкарыстанні інфармацыйных тэхналогій і камп'ютэрных гульняў у сваёй прафесійнай дзейнасці.

**А.А.Жалуновіч,** *дацэнт*

## ПАЗААЎДЫТОРНАЯ РАБОТА ЯК СТРУКТУРНЫ ЭЛЕМЕНТ НАВУЧАННЯ

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Пазааўдыторная (дамашняя) самастойная работа студэнтаў – неабходная састаўная частка вучэбнага працэсу. Яна цесна звязана з аўдыторнай работай, якая праводзіцца пад кіраўніцтвам выкладчыка, дапаўняе і забяспечвае яе эфектыўнасць.

Дамашняе заданне выступае ў двух якасна розных варыянтах: як заданне для заняткаў і як заданне, якое прапануецца студэнту для самастойнага пазааўдыторнага выканання. Заданні, што даюцца на аснове папярэдніх заняткаў, з'яўляюцца асновай кантролю (звычайна ў першай палове) ступені засваення раней вывучанага матэрыялу. Дамашняе заданне для наступных заняткаў выступае як план будучай работы. Гэтае заданне адносіцца на канец заняткаў ці на канец кожнай яго мэтавай часткі. Задача выкладчыка заключаецца ў тым, каб адэкватна сфармуляваць падабраныя для самападрыхтоўкі заданні, вызначыць, за які час і дзе яны павінны выконвацца.

Першае, што сведчыць аб неабходнасці пазааўдыторнай работы, – гэта фактар часу. Як вядома, немагчыма ў поўнай меры

ахапіць увесь матэрыял курса на аўдыторных занятках.Акрамя гэтага, немалую ролю ў сістэме навучання адыгрывае колькасць «сустрэч» з мовай. Кожнае дамашняе заданне падвойвае кантакты з мовай, а калі яго размеркаваць на некалькі прыёмаў выканання, то гэта павялічвае іх у некалькі разоў.

Па-другое, калі выкананне дамашніх заданняў асэнсоўваецца студэнтамі як пэўная частка навучання, то можна выкарыстаць такую аптымальную форму навучання, як «выкладанне–дыялог». На сённяшні дзень перавага аддаецца іншай форме – маналогу выкладчыка. Так званы маналог перарываецца пытаннямі да студэнтаў ці размовай-дыялогам з ініцыятывай выкладчыка. А дыялагічная форма навучання непасрэдна звязана з большай падрыхтаванасцю студэнтаў да канкрэтнай і загадзя вызначанай працы на занятках, з павышэннем элемента самасвядомасці ў навучанні. На наш погляд, гэта крок наперад у павышэнні эфектыўнасці выкладання.

Па-трэцяе, у метадычна арганізаваным курсе навучання кожнаму аўдыторнаму заданню адпавядае заданне для самастойнай работы. Пры гэтым у выкладчыка ёсць магчымасць вар'іраваць аўдыторныя заданні ў залежнасці ад мэты заняткаў і курса цалкам.

Так, самастойны аналіз раздзела падручніка і паказаных у ім фрагментаў моўнага матэрыялу – гэта дамашняе заданне; першапачатковая трэніроўка вядомых формаў у пэўных сітуацыях і фармуляванне правіла ці складанне табліцы – аўдыторныя заданні. Магчымы яшчэ варыянт. Практыкаванне на трэніроўку граматычных формаў – дамашняе заданне; практыкаванне на сітуацыйнае ўжыванне вызначаных формаў – аўдыторнае заданне, якое выконваецца пад непасрэдным кантролем выкладчыка. Як бачым, ва ўсіх варыянтах аўдыторныя і пазааўдыторныя заданні складаюць узаемазвязаны блок, маюць агульную мэту – фарміраванне канкрэтных навыкаў на базе пэўнага моўнага матэрыялу.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Віды заданняў для самастойнай пазааўдыторнай работы студэнтаў дастаткова разнастайныя. Некаторыя з іх з'яўляюцца стандартнымі і абавязкова выконваюцца ў курсе выкладання мовы, а іншыя – больш прадукцыйныя – практыкуюцца радзей, бо патрабуюць дадатковай метадычнай распрацоўкі. Так, у якасці тыповых дамашніх заданняў выступаюць практыкаванні грамматыка-лексічнага характару, накіраваныя на адпрацоўку формаў і актывізацыю лексікі. Да ліку перспектыўных адносяцца калектыўныя заданні, якія прапануюцца ўсёй групе. Гэта можа быць, напрыклад, падрыхтоўка выступленняў па актуальнай праблематыцы, дыялога-дыскусіі па раней вызначанай тэме. Прычым тэма вызначаецца групай самастойна.

Мала распрацавана методыка вучэбных камунікатыўных практыкаванняў, звязаных з прафесійнымі патрабаваннямі студэнтаў. Тут якраз і праяўляецца педагагічнае майстэрства выкладчыка. Ліквідацыі недахопу правільнага ўжывання спецыяльнай лексікі садзейнічаюць сітуацыйна накіраваныя практыкаванні. Вучэбная маўленчая сітуацыя ў іх складаецца з умоў сітуацыі і моўнага рэагавання студэнтаў. Да іх адносяцца: а) апісанне сітуацыі, якое ўключае інфармацыю аб месцы і ўдзельніках размовы, б) моўны стымул, в) заданне. У якасці станоўчых момантаў вучэбнай сітуацыі маўлення можна адзначыць, што яна ставіць студэнта ва ўмовы, блізкія да рэальных; дазваляе актывізаваць лексіка-граматычны матэрыял, не фіксуючы ўвагі на ім; развівае ўяўленне і садзейнічае стварэнню мэтанакіраванага маўлення. Напрыклад: «Вы ў камп'ютэрным класе, папрасіце расказаць, з чаго пачынаць працу на камп'ютэры»; «Уявіце, што вы рэжысёр , дайце заданне членам свайго гуртка перад спектаклем, святочным мерапрыемствам»; «Вы мастак, раскажыце сябру пра асноўныя віды жывапісу» і інш. На першы погляд гэта даволі “дзіцячыя” заданні для студэнта, але толькі ў працэсе падрыхтоўкі і выканання разгортваюцца тыя складанасці пабудовы фразы, граматычнага афармлення патрэбнай лексікі і

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

нават вымаўлення, якія пэўным чынам адлюстроўваюць сучаснае становішча беларускай мовы.

Да вучэбнага моўнага працэсу ёсць адназначнае абавязковае патрабаванне – выконваць прынцып сузалежнасці прапанаванага дамашняга задання і аўдыторнай работы. Напрыклад, асаблівасці скланення колькасных лічэбнікаў –тэма тэарэтычна і практычна складаная. Таму будзе карысным і захапляльным падрыхтаванае студэнтамі апавяданне пра свае любімыя стравы і рацэпт іх прыгатавання. Акрамя таго, змястоўнай будзе інфармацыя пра дасягненні вядомых майстроў спорту. Такім чынам, у аўдыторыі праходзіць апрацоўку не толькі канкрэтная граматычная тэма, але яшчэ пашыраецца магчымасць прыцягнуць да актыўнага ўжывання розныя пласты лексікі.

Пры ўсёй разнастайнасці відаў пазааўдыторнай работы захоўваецца важнае патрабаванне – як мага часцей выкарыстоўваць прыём індывідуалізацыі заданняў пры групавым навучанні. Так, напрыклад, пры вывучэнні граматычных катэгорый назоўнікаў тыповае дамашняе заданне (скласці сказы з прапанаванымі словамі) можна ўдакладніць словамі, «якія па магчымасці звязаць пэўным сюжэтам». Вопыт праверкі такіх заданняў ( яна абавязкова праходзіць у аўдыторыі і ў выкананні аўтараў) паказаў, што творчы момант задання захапляе студэнтаў. Гэта своеасаблівае праяўленне эмоцый і інтэлекту. У такіх заданнях праяўляюцца не толькі правільнасць ужывання граматычнай з'явы ці моўнай адзінкі, але і раскрываецца творчы патэнцыял кожнага.

Такім чынам, індывідуалізацыя задання на агульную тэму ў сваю чаргу павышае эфектыўнасць праверкі і аўдыторных занятказ, таму што кожны студэнт групы атрымлівае ад сваіх сяброў дадатковую, цікавую для яго інфармацыю. Рацыянальная форма праверкі дазваляе выкарыстаць самастойна засвоены матэрыял у новым камунікатыўна значным заданні пад кіраўніцтвам выкладчыка, а таксама фарміруе навыкі самакантролю і ўзаемакантролю.

Безумоўна, ініцыятыва ў працэсе навучання належыць выкладчыку, але гэта не значыць, што ініцыятыва і самасвядомасць

студэнтаў не маюць значэння. Выкладанне – працэс двухбаковы. І, каб павысіць яго эфектыўнасць, выкладчык павінен увесь час апеляваць да самасвядомасці, інтарэсу і здольнасцей студэнтаў. Менавіта гэтай мэце і служыць правільна арганізаваная пазааўдыторная работа.

**Л.Д.Жмуровская,** *ст.преподаватель*

## О НЕКОТОРЫХ ОСОБЕННОСТЯХ РАБОТЫ СО СТУДЕНТАМИ СПЕЦИАЛЬНЫХ ГРУПП

Стремительный рост научно-технической информации и расширение международных контактов постоянно предъявляют новые требования к подготовке специалистов высших учебных заведений. В Белорусском государственном университете культуры иностранный язык всегда являлся неотъемлемым компонентом учебного процесса. Его изучают студенты всех специальностей и специализаций как дневной, так и заочной форм обучения. Несколько лет назад на факультете библиотечно-информационных систем введена новая специализация «библиография, библиотековедение и иностранный язык», которая позволяет готовить библиотечных работников с высоким уровнем владения иностранным языком. Какова же специфика работы со студентами спецгрупп? На что должен обратить внимание преподаватель, работающий в этих группах?

Прежде всего следует отметить высокую мотивационную заинтересованность студентов, занимающихся в специальных группах. Большинство студентов легко контактируют с преподавателем, им интересно высказывать свои мысли и суждения на английском языке, языковые неточности и погрешности в своей речи их не смущают. Рутинные виды учебных работ, требующие умения анализировать лексические, синтаксические и граммати-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ